Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІСТАПАДА 2014 г. ПЯТНІЦА № 226 (27836) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Праблемных дамоў налета не будзе**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Грані таленту Уладзіміра Цэслера**

СТАР. 15

*ЛІЧБА ДНЯ*

**536,8**

**тысячы**

***інвалідаў налічваецца ў краіне на лістапад бягучага года (у тым ліку 27,4 тысячы дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў). Гэта складае 5,7% насельніцтва. У Беларусі параўнальна невялікая ўдзельная вага інвалідаў у параўнанні з краінамі СНД і Еўропы, дзе гэты паказчык значна вышэйшы. Разам з тым у апошнія 5 гадоў адзначаецца рост першаснай інваліднасці, праўда, у апошнія 2 гады назіраецца яго стабілізацыя. На рост інваліднасці ўплываюць аб'ектыўныя медыцынскія, а таксама сацыяльна-эканамічныя прычыны. Вялікае значэнне мае і лібералізацыя дзейнага заканадаўства — гаворка ідзе аб змене крытэрыяў да вызначэння інваліднасці.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10800,00 | ■ |
| Еўра | 13520,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 227,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 709,36 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Жыццёва важная навука

ДАІ амаль штомесяц праводзіць у розных гарадах краіны аперацыю «Пешаход». Напрыклад, якраз гэтымі днямі падобная акцыя праходзіць у сталіцы. Асаблівую ўвагу інспектары надаюць аварыйна-небяспечным пераходам, месцам, дзе шмат людзей, праводзяць гутаркі ў школах і на прадпрыемствах... Але ні для каго не сакрэт, што лепшай навукай для дзяцей заўсёды служыць прыклад самых родных людзей. І выкладаць гэту жыццёва важную навуку, навуку бяспекі, мы ім павінны не падчас нейкай адмысловай акцыі, а штодня.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Медыцына ў развіцці

# УРАЧ, ПАЦЫЕНТ І КАМП'ЮТАР

**Ахова здароўя ва ўсім свеце становіцца электроннай — eHealth (прыстаўка «е» якраз гэта і сімвалізуе, Health з англійскай — здароўе). Больш за палову краін свету намагаюцца ў гэтым кірунку. Наша краіна не выключэнне. Абапіраюцца ўсе разам на методыку, прапанаваную Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя і Міжнародным саюзам электрасувязі. Што ж абяцае ўкараненне eHealth? Напрыклад, дыстанцыйнае ўзаемадзеянне ўрача і пацыента (TeleHealth) з дапамогай сацыяльных сетак, Skype, кішэнных камп'ютараў, інтэрнэт-планшэтаў. Словам, гэта фантастычныя магчымасці як для саміх медработнікаў, так і для нас, пацыентаў.**



## ЭСТОНІЯ ЗРАБІЛА РЫВОК

Цэнтральным элементам eHealth у многіх краінах Еўропы стала інтэграваная электронная медыцынская картка з інфармацыяй у выглядзе электронных медыцынскіх дакументаў. У ЗША адзіная інфармацыйная сістэма ў галіне аховы здароўя сёння робіць акцэнт на стварэнні электроннага пашпарта здароўя, інфармацыйнай інфраструктуры аховы здароўя, электронным абмене медыцынскімі звесткамі.

СТАР. 4

■ Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ — МАРОЗ І НЕВЯЛІКІ СНЕГ

**Сур'ёзны холад пачне адступаць толькі ў сярэдзіне наступнага тыдня**

**У апошнія дні восені на тэрыторыі нашай краіны захаваецца зімовы характар надвор'я. У пятніцу невялікі снег пройдзе толькі ў асобных раёнах. Месцамі слабы туман, а на дарогах узнікне галалёдзіца, паведаміў начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад 3 да 9 марозу. На выхадныя будзе пераважна без ападкаў, аднак невялікі снег магчымы ў паўднёва-ўсходніх раёнах краіны. Зноў месцамі туман, а на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на суботу і нядзелю прагназуецца мінус 6-13 градусаў, удзень — 2-8 градусаў ніжэй за нуль. У першыя дні зімы тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў антыцыклону, цэнтр якога будзе рухацца ў бок паўночна-ўсходніх раёнаў краіны. Будзе без істотных ападкаў, але месцамі туман і галалёд. Пахаладае яшчэ мацней. Тэмпература паветра ўначы складзе 6-13 марозу, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. А ўдзень у гэтыя два дні халады будуць трымацца на ўзроўні мінус 3-8 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у сераду і чацвер месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. Таму крыху пацяплее. Уначы будзе толькі мінус 5-11 градусаў, а ўдзень — 1-6 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПЛЯЧО СЯБРА ЛЕПШ НЕ ГУБЛЯЦЬ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў сваю пазіцыю адносна абмежавання паставак беларускай прадукцыі ў Расію**

«Мяне сёння паводзіны расійскіх улад не проста здзіўляюць, а засмучаюць. Калі ў бліжэйшы час не будзе нармалізаваны гандаль паміж дзвюма краінамі, мы вымушаны будзем рэагаваць. Што гэта за паводзіны такія?!» — адзначыў беларускі лідар учора падчас сустрэчы з губернатарам Санкт-Пецярбурга Георгіем Палтаўчанкам, паведаміла БЕЛТА.

«У мяне ствараецца ўражанне, што на прыкладзе Беларусі чарговы раз, узяўшыся то за газавую трубу, то за нафтавую, а цяпер за харчовыя пытанні, хочуць паказаць камусьці або ўсяму свету, праўучыць некага. Але мы ж не шчаняты, каб нас за каршэнь вадзіць, выбачайце за гэту грубасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў заўважыў, што ў гэтай сітуацыі трэба сесці і дамовіцца.

«Гэта начыста адмятаецца з расійскага боку. Трэба было ўчора Сямашку сустрэцца з Дварковічам, каб намецідь нейкія шляхі. Але ў нас ёсць закон, мытныя пагадненні, мы заўтра пачынаем работу ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Якія могуць быць перашкоды ў пастаўках тавараў?!» — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў: бакі дамовіліся, што павінна быць прамое бесперашкоднае перамяшчэнне тавараў, грузаў, рабочай сілы. «Калі вы лічыце, што мы нешта парушылі, мы ж без усякіх скандалаў можам разабрацца ў гэтым», — дадаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўзяў гэтыя пытанні на кантроль. «Тры месяцы мы на гэта не рэагавалі — бачу, што пытанні не вырашаюцца, — адзначыў Прэзідэнт. — Не трэба нас прэсінгаваць. Мы былі вам надзейнымі сябрамі і будзем. Але калі вы нас пачняце шчаміць, вы ведаеце, што я цярпець не буду».

«І потым, я не разумею: вы што, спецыяльна гэта робіце, каб узняць цэны ў Расійскай Федэрацыі? Мы ж пастаўляем вам прадукцыю па самых нізкіх цэнах. Але дэфіцыт тавараў, асабліва мяснай прадукцыі на рынках Расіі, — гэта ж рост цэн. Навошта вы гэта робіце? Мне наогул гэта не зразумела», — адзначыў Прэзідэнт.

«Прытым нам кажуць адкрыта, што мы перапрацоўваем сыравіну, купляем штосьці на Захадзе. Але мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі і з прэм'ерам, што гэта не ёсць парушэнне эмбарга, — прадоўжыў беларускі лідар. — Што граху таіць, — сёння, калі ў іх (на Захадзе. — **Заўвага БЕЛТА**) узніклі праблемы, асабліва ў суседзяў, яны гатовы па зніжаных цэнах гэтую сыравіну аддаваць. І дзякуй. $100 млн заробіць Беларусь на працягу года — гэта што, грошы? І гэта што, дрэнна?» Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Беларусі трэба вяртаць крэдыты Расіі. «Пуцін кажа: вам ніхто не перашкаджае, перапрацоўвайце сыравіну, але прамога транзіту не павінна быць. Дайшлі да таго, што паставілі ў Манголію партыю тавару, а дзесьці ў Бураціі вярнулі тавар назад. Але гэта ж пастаўкі ў Манголію. Пастаўляюць у Казахстан. Расіяне: у нас насцярожанасць, што з Казахстана завязуць у Расію. Дык вы кантралюйце казахаў, каб яны не завезлі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Калі хтосьці з вашых хоча пагрэць рукі на сітуацыі, узняць цану, то гэта не наша пазіцыя. Мы народы павінны абараняць. Сёння расіянам нялёгка, цэны ўзнімаюцца кожны дзень, — адзначыў Прэзідэнт. — У Новасібірску ўзнікла праблема з грэчкай. Ёсць у нас магчымасць — 120 тон у Новасібірск імгненна адправім. Мы стараемся вырашаць вашы праблемы, а вы пачынаеце нас душыць. Нельга так рабіць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь стараецца дапамагчы збіць цану на тавары ў Расіі, прапануючы больш танную беларускую прадукцыю. Ён параіў расійскаму боку разабрацца «з розным жуллём, якое на гэтым жыруе, з гандлярамі і іншымі».

«Нам трэба ўстараняць усялякія бар'еры. Сяброў у нас у свеце вы ведаеце колькі. І вы ведаеце, якая пазіцыя ў іншых дзяржаў. Таму давайце не губляць плячо адно аднаго», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Не трэба думаць, што Беларусь меншая, чым Расія, і яна ні на што не здольная. Мы вельмі нават многае можам. І мы ніколі не кідалі Расію. Не кінем і ў гэтай сітуацыі. Мы на гэтым сабе карысці шукаць не маем намеру. Гэта наша Расія, і мы яе будзем абараняць, як сваю тэрыторыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

***

Закранаючы тэму супрацоўніцтва Беларусі і Санкт-Пецярбурга, Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў, што па выніках 2013 года таваразварот паміж нашай краінай і гэтым суб'ектам федэрацыі склаў $1,9 млрд. Сёлета плануецца выйсці на аб'ём гандлю $2 млрд. «Добра, што мы ад прамога гандлю перайшлі да стварэння сумесных праектаў, перш за ўсё ў сферы прамысловай кааперацыі. Гэта важны напрамак, і мы будзем яго падтрымліваць», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што супрацоўніцтва Беларусі з Санкт-Пецярбургам можа быць узорам для іншых расійскіх рэгіёнаў. «Хацелася б, каб наша супрацоўніцтва было прыкладам для ўсёй Расіі — і ў будаўнічай сферы, і ў культуры, і ў ахове здароўя», — сказаў беларускі лідар.

# Андрэй Раўкоў — новы міністр абароны



**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прызначыў генерал-маёра Андрэя Раўкова міністрам абароны, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пры выбары кандыдатуры на пасаду міністра абароны кіраваўся прынцыпам амаладжэння кадраў і зрабіў стаўку на больш маладога і перспектыўнага генерала.

«Многія мяне насцярожвалі тым, што ён не служыў у цэнтральным апараце, не зусім з гэтымі правіламі знаёмы. Можа, гэта і загана, але часта гэта бывае ў плюс, — лічыць Прэзідэнт. — Разумны чалавек зусёды разбярэцца ў сітуацыі ў цэнтральным апараце, але і прыўнясе штосьці знізу, нам гэта вельмі патрэбна. Нам гэта трэба і ў цывільных ведамствах, і ў ваенных перш за ўсё».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што, хоць Андрэй Раўкоў і прызначаны міністрам абароны, адказнасць за армію нараўне з ім нясуць дзяржаўны сакратар Савета бяспекі, а таксама члены калегіі Міністэрства абароны.

## Парламенцкі дзённік

# СУГУЧНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

**«Беларусь і В'етнам цэняць магчымасць будаваць свой лёс незалежна», — сказаў Анатоль Рубінаў, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, падчас афіцыйнай сустрэчы з дэлегацыяй Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам на чале з генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама Нгуэн Фу Чонгам.**

«Зносіны паміж Беларуссю і В'етнамам традыцыйна сяброўскія і прайшлі выпрабаванне часам», — дадаў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Па словах старшыні Савета Рэспублікі, супрацоўніцтва з В'етнамам Беларусь разглядае як адзін з найбольшых прыярытэтаў знешняй палітыкі краіны ў Азіяцкім рэгіёне. І хоць дыпламатычныя зносіны паміж краінамі налічваюць не больш за 20 гадоў, беларускі і в'етнамскі народы звязваюць даўнія вузы дружбы.

— Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць нашых краін, у іх падобны лёс, — лічыць Анатоль Рубінаў. — І беларускаму, і в'етнамскаму народу давялося шмат перажыць для таго, каб адстаяць сваю незалежнасць, заваяваць права на самастойнае развіццё, на будаўніцтва ўласнага лёсу. Нашы народы занадта дорага заплацілі за гэтае права. Менавіта тыя народы, якія прайшлі праз выпрабаванні, асабліва высока цэняць мір, стабільнасць і стваральную працу.

Мэты і прыярытэты Беларусі і В'етнама вельмі падобныя. Беларусі цалкам сугучны такія прыярытэты развіцця, як умацаванне ўсенароднай еднасці, абарона незалежнасці, суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэльнасці. І, вядома, захаванне палітычнай стабільнасці і міру.

У адказ Нгуэн Фу Чонг адзначыў, што ён «прыемна ўражаны Беларуссю і яе гасцінным, дружалюбным народам». І таксама спадзяецца на працяг актыўнага супрацоўніцтва нашых краін.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# РЫХТУЕЦЦА НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ ЗАКОНА АБ НАТАРЫЯЦЕ

**Неабходнасць у карэкціроўцы дзейнага закону, які быў прыняты 10 гадоў таму, узнікла пасля падпісання ў лістападзе мінулага года Прэзідэнтам Беларусі Указа №523, які ўстанавіў, што з 1 студзеня 2014 года беларускія натарыусы ажыццяўляюць сваю прафесійную дзейнасць на ўмовах самакіравання і самафінансавання. Акрамя Закона «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» законапраектам уносяцца змены яшчэ ў шэсць законаў і заканадаўчых актаў.**

Днямі ў Палаце прадстаўнікоў адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі па заканадаўстве пад кіраўніцтвам старшыні камісіі Людмілы Міхальковай, на якім абмяркоўваліся тыя палажэнні законапраекта, што супярэчаць Указу №523.

— Навела гэтага законапраекта заключаецца ў норме, звязанай з прыняццем натарыусам грашовых сродкаў і каштоўных папер ад грамадзян і юрыдычных асоб з адкрыццём у банках дэпазітных рахункаў з асаблівым прававым рэжымам, — патлумачыла журналістам **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы законапраекта да першага чытання Наталля ГУЙВІК.** — Згодна з праектам, грашовыя сродкі, якія будуць паступаць на дэпазіт натарыуса, не будуць лічыцца даходам, таму банкам на іх не будуць налічвацца працэнты; таксама банкі не будуць браць плату за аказаную паслугу па адкрыцці і закрыцці такога рахунку, па аперацыях з гэтымі грашовымі сродкамі.

Карэкціроўка нормаў Закона «Аб натарыяце» прадугледжвае змены агульных палажэнняў, якія датычацца статусу натарыуса, абмежаванняў, якія з ім звязаны, набыцця гэтага статусу, прыпынення, аднаўлення, спынення паўнамоцтваў натарыуса, анулявання сведчанняў пра ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці, арганізацыйных формаў натарыяльнай дзейнасці і органаў натарыяльнага самакіравання, аплаты працы натарыуса, аплаты яго дзеянняў і паслуг і іншых.

Праект закону ліквідуе такія паняцці, як «дзяржаўны натарыус» і «прыватны натарыус», «дзяржаўная натарыяльная кантора», «ведамасныя натарыяльныя архівы», выключае норму пра ліцэнзаванне прыватнай натарыяльнай дзейнасці і пашырае паняцце «натарыяльная тайна». Апошняя ўключае ў сябе не толькі натарыяльныя дзеянні, але і тыя сведчанні, якія натарыус атрымаў, калі даваў кансультацыю грамадзянам і юрыдычным асобам. Таксама пашыраюцца паўнамоцтвы Беларускай натарыяльнай палаты.

Колькасць змен і дапаўненняў, якія ўносяцца ў закон «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці», складае больш за палову яго тэксту, таму размова ідзе, па сутнасці, пра новую рэдакцыю закону.

У пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў удзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі, галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта, Беларускай і Мінскай гарадской натарыяльных палат, Савета Рэспублікі і Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.

Па выніках пасяджэння было вырашана працягнуць падрыхтоўку законапраекта да першага чытання.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

## Знешняя палітыка

# ЗБІРАЕЦЕСЯ Ў ТУРЦЫЮ — ПРАВЕРЦЕ ПАШПАРТ

**З першага студзеня наступнага года ў Турцыі ўводзіцца новае патрабаванне. Так, пашпарты грамадзян Беларусі, якія маюць права на бязвізавае наведванне Турцыі на працягу 30 дзён, павінны быць сапраўдныя не менш як 90 дзён з моманту ўезду ў гэтую краіну. Такое паведамленне зрабіў Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў падчас чарговага брыфінгу.**

Другімі тэмамі, да якіх звярнуўся прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства, былі адносіны Беларусі з МАГАТЭ, беларуска-армянскія кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў і пасяджэнне сумеснай беларуска-польскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве.

## Кіраўніцтва МАГАТЭ наведае БелАЭС

У пачатку наступнага тыдня нашу краіну разам з дэлегацыяй наведае намеснік генеральнага дырэктара Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Дэніс Флоры. Асноўнай мэтай візіту заяўлена абмеркаванне міжнароднага вопыту ў сферы забеспячэння ядзернай бяспекі, развіцця культуры ядзернай бяспекі. У склад дэлегацыі ўвойдуць прадстаўнікі кіраўніцтва органаў, якія рэгулююць ядзерную і радыяцыйную бяспеку, з Расіі, Францыі, ЗША, В'етнама, а таксама супрацоўнікі сакратарыята МАГАТЭ і Еўрапейскай камісіі. Прадугледжваецца, што ў рамках візіту Дэніс Флоры наведае пляцоўку будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі.

Нагадаем, некалькі дзён таму Уладзімір Макей, міністр замежных спраў нашай краіны, быў у Вене і сустракаўся там з кіраўніцтвам МАГАТЭ. Падчас сустрэчы міністр падкрэсліў, што Беларусь нацэлена на канструктыўнае ўзаемадзеянне з агенцтвам. Таксама была пацверджана гатоўнасць нашай дзяржавы ў любы час прымаць місіі Агенцтва, у тым ліку на пляцоўцы будаўніцтва Беларускай АЭС.

## Арменія стане бліжэй

Нядаўна ў Мінску прайшлі беларуска-армянскія кансультацыі паміж знешнепалітычнымі ведамствамі. Дыпламаты абмеркавалі задачы па далейшым развіцці беларуска-армянскіх адносін, у тым ліку перспектывы пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і міжрэгіянальных сувязяў.

— Належная ўвага нададзена пытанню развіцця інтэграцыйных працэсаў з улікам будучага членства Арменіі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, — адзначыў Дзмітрый МіронЧык.

## Польшча «далучыцца» да еўразійскай інтэграцыі?

У першыя дні наступнага месяца ў Варшаве пройдзе трэцяе пасяджэнне сумеснай беларуска-польскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве і Беларуска-польскі інвестыцыйны форум.

— Падчас перамоў будуць абмеркаваны перспектыўныя напрамкі пашырэння гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Польшчай, а таксама ўзаемадзеяння ў сферах транспарту, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, спорту і турызму, аховы навакольнага асяроддзя, — паведаміў прэс-сакратар МЗС. — Важнай тэмай стане супрацоўніцтва ў галіне стандартызацыі, энергаэфектыўнасці, зняцця тэхнічных бар'ераў у гандлі з улікам функцыянавання Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Соцыум

**Анатоль РАЖАНЕЦ,** начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

# «ЗРОБІМ ЖЫЦЦЁ АДЗІНОКІХ СТАРЫХ БОЛЬШ СВЕТЛЫМ»



## Новыя паслугі аказваюць дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў

— Сярод новых формаў сацыяльнага абслугоўвання — кароткатэрміновае пражыванне (да 1 месяца) пажылых людзей і інвалідаў на платнай аснове; знаходжанне ў аддзяленнях павышанай камфортнасці на платнай аснове; паслуга сацыяльнай перадышкі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. У дамах-інтэрнатах створаны аддзяленні суправаджанага пражывання з мэтай аказання садзейнічання інвалідам у падрыхтоўцы да самастойнага жыцця па-за стацыянарнымі ўстановамі, адаптацыі да ўмоў побыту і працоўнай дзейнасці.

Сёння сетка дзяржаўных стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання ўключае 80 дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў: 47 псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў (у іх пражываюць 12,2 тыс. чалавек), 23 дамыінтэрнаты для састарэлых і інвалідаў агульнага тыпу (4,2 тыс. чалавек); 10 дзіцячых дамоў-інтэрнатаў для 1,8 тыс. дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў.

Хачу дадаць, што інваліды могуць скарыстацца правам на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне. З 1 студзеня 2007 года забеспячэнне непрацуючых пенсіянераў і інвалідаў пуцёўкамі ажыццяўляецца прадстаўніцтвамі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні. У сістэме Міністэрства працы і сацыяльнай абароны функцыянуюць чатыры санаторыі на 810 месцаў, якія працуюць са стапрацэнтнай загрузкай, штогод у іх папраўляюць сваё здароўе больш за 16 тыс. чалавек. Бясплатна ў іх аздараўляюцца непрацуючыя інваліды першай і другой груп, з частковай аплатай — ветэраны працы і інваліды трэцяй групы (як правіла, 15-25% ад кошту пуцёўкі ў залежнасці, у асноўным, ад сезона).

Дарэчы, дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2014 год на будаўніцтва і рэканструкцыю санаторыяў, якія ўваходзяць у сістэму Мінпрацы і сацыяльнай абароны, прадугледжана выдаткаваць сродкі з рэспубліканскага бюджэту ў памеры Br36 млрд.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ** ■

■ Жыллё

# «ЗАМАРОЖАНЫЯ» ЖЫЛЛЁВА-БУДАЎНІЧЫЯ КААПЕРАТЫВЫ РАСФАРМІРУЮЦЬ



## А членам такіх ЖБСК прапануюць будавацца на ўмовах дзяржаўнага заказу

**Учора аб праблемных пытаннях у будаўнічай і транспартнай сферах на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве дэпутатам дакладваў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН.**

### ПРАБЛЕМНЫХ ДАМОЎ НАЛЕТА НЕ БУДЗЕ

Практычна, сапраўды праблемных дамоў у Беларусі сёння няма, лічыць віцэ-прэм'ер, засталася невялікая колькасць аб'ектаў са звышнарматыўным тэрмінам будаўніцтва. Летась гэта праблема была масавай. Сёння ж падобных дамоў засталіся адзінкі. Апошнія дзевяць такіх дамоў плануецца здаць у эксплуатацыю ўжо праз месяц.

Апошнія станоўчыя змены ў будаўнічай галіне паспрыялі зніжэнню колькасці крытычных зваротаў грамадзян па гэтай тэматыцы ў Адміністрацыю Прэзідэнта і Саўмін па выніках дзевяці месяцаў ажно на 25%.

### СТАЎКА НА ДЗЯРЖЗАКАЗ

Цяпер чаргавікам, якія маюць права на атрыманне льготнага крэдыту, прапануюць будавацца па сістэме дзяржзаказу. Кошт квадратнага жылля па гэтай схеме адпавядае сярэднямесячнаму заробку, скарэктаванаму каэфіцыентам 1,2. Анатоль Калінін адзначыў, што гэтая ўмова сёлета цалкам вытрымліваецца. Так, у кастрычніку падобны каэфіцыент па коштам «квадрата» склаў 1,15. Асобна дакладчык спыніўся на тэме жыллёва-будаўнічых кааператываў. Усе ЖБСК, якія пачалі будаўніцтва ў 2014 годзе, але не завяршылі яго, уключаны ў праграму на будучы год. Гэтыя дамы будуць абавязкова пабудаваны. Што тычыцца ЖБСК, якія нават не пачалі будаўніцтва, то прынята рашэнне аб іх расфарміраванні з прадастаўленнем права членам таварыстваў будавацца на ўмовах дзяржаўнага заказу. Паводле слоў прэм'ер-міністра, выдаткі такіх кааператываў будуць кампенсавацца.

Нагадаем, што па ўжо зацверджанай праграме ўрада ў Беларусі ў 2015 годзе будзе пабудавана 5 мільёнаў квадратных метраў жылля. З іх крыху больш за 1 мільён — па дзяржзаказе. Прычым будавацца плануюць у абласцях па 150-300 тысяч квадратных метраў жылля. А вось у Мінску па дзяржаўнай схеме — усяго 14,7 тысячы квадратных метраў, у Мінскай вобласці — 16 тысяч «квадратаў». Тады як толькі ў Мінскай вобласці больш за шэсцьдзясяткаў ЖБСК чакалі пачатку будаўніцтва менавіта налета.

Выкананне дзяржаўнай жыллёвай палітыкі дазволіць захаваць пераважнае права на атрыманне дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве жылля ў першую чаргу для шматдзетных сем'яў і вайскоўцаў. Прадугледжана зніжэнне перыяду забеспячэння жыллём да трох гадоў шматдзетным сем'ям, а грамадзянам, якія маюць права на атрыманне сацыяльнага жылля — да 5 гадоў (у Мінску — да 7 гадоў).

### ГОРАДАБУДАЎНІЧАЯ ПАЛІТЫКА

У Беларусі запланавана ажыццяўляць канцэпцыю збалансаванага развіцця рэгіёнаў, паведаміў дэпутатам намеснік прэм'ер-міністра. Гэтая канцэпцыя прадугледжвае і аптымізацыю колькасці насельніцтва ў сталіцы краіны. Акрамя таго, за межы горада ў іншыя населеныя пункты неабходна вывесці шэраг прамысловых прадпрыемстваў.

Дзеля гэтага плануецца далейшае развіццё гарадоў-спадарожнікаў Мінска і абласных цэнтраў. Ужо вызначана, што жыллё ў такіх гарадах будзе будавацца паводле прынцыпу стварэння шматфункцыянальных раёнаў з фарміраваннем жылога фонду пераважна ў выглядзе дамоў малой і сярэдняй павярховасці. Адначасова там плануецца ствараць сучасныя і інавацыйныя вытворчыя комплексы.

### АД КАМУНАЛЬНІКАЎ ПАТРАБУЮЦЦА ЯКАСНЫЯ ПАСЛУГІ

Рэформы ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі накіраваны на павышэнне адказнасці як пастаўшчыкоў, так і спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг. «Мы бачым, што многія пытанні ўтрымання прысутнічаюць у нашым грамадстве. Уносім прапановы для вырашэння і гэтай задачы», — канстатаваў Анатоль Калінін. Намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што пераўтварэнні закрануць структуру жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў цэлым. У прыватнасці, будзе аптымізавана колькасць кіраўніцкага персаналу, а стаўку зробяць на выканаўцаў паслуг. Плануецца павысіць матывацыю работнікаў, увязаўшы яе з якасцю аказаных паслуг. Мяркуецца, што рэалізацыя рэформаў дазволіць адысці ад крытыкі з боку насельніцтва. Пры гэтым, як адзначыў Анатоль Калінін, ужо ўдалося дасягнуць пэўнага прагрэсу — колькасць зваротаў грамадзян у сферы ЖКГ зменшылася з пачатку года амаль на 10%.

Анатоль Калінін нагадаў і пра іншыя інфраструктурныя праекты, якія цяпер трапілі на стадыю рэалізацыі. Адзін з іх — рэканструкцыя Нацыянальнага аэрапорта. У 2015 годзе там пачнецца будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

■ Будзь у курсе!

# Новы год у аўтобусе не сустрэнеш

**У сувязі са святкаваннем Новага года дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» у канцы снежня-пачатку студзеня адмяняе рэйсы па некаторых міжнародных маршрутах.**

Так, толькі 1 студзеня наступнага года адмяняюцца рэйсы па маршрутах: Мінск — Вільнюс (адпраўленнем з Мінска ад АВ «Цэнтральны» ў 9.20, з Вільнюса — у 14.00), Мінск — Каўнас (адпраўленнем ад АВ «Цэнтральны» ў 8.40, з Каўнаса — у 16.00). Толькі 30 і 31 снежня адмяняюцца рэйсы па маршруце Мінск — Кіеў (Ачакаў) (адпраўленнем з Мінска ад АВ «Цэнтральны» ў 18.30, ад АВ «Усходні» ў 18.50, з Кіева адпраўленнем у 19.30, адпаведна, 31 снежня і 1 студзеня). У апошнія дні гэтага года і першыя наступнага нельга будзе скарыстацца некаторымі рэйсамі па маршрутах Мінск — Варшава, Мінск — Калінінград, Мінск — Масква, Мінск — Рыга (праз Браслаў і Даўгаўпілс), Мінск — Рыга (праз Вільнюс), Мінск — Санкт-Пецярбург. Таму перад падарожжам лепш звярыцца з раскладам руху аўтобусаў у міжнародных зносінах.

Затое з 1 студзеня наступнага года аднаўляецца рух па маршруце Мінск — Санкт-Пецярбург на рэйсы адпраўленнем у 15.00 і 17.40, якія будуць выконвацца прадпрыемствам «Мінсктранс» праз дзень (1, 3, 5, 7 студзеня і г.д) з Мінска (і, адпаведна, з Санкт-Пецярбурга 2, 4, 6, 8 студзеня і г.д.).

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# ЗАМОК НА ШЧАСЦЕ

**Пасля таго, як у Парыжы абрынуўся мост, камунальныя службы ўсяго свету, здаецца, звярнулі ўвагу на традыцыю маладых у дзень вяселля вешаць замкі. У Брэсце, напрыклад, слесары тры дні пілавалі замкі на металічных канструкцыях моста ў гарадскім парку. І адвялі для замкоў іншае месца.**




У Пружанах падышлі да вырашэння праблемы грунтоўна. Раней маладыя пары вешалі замкі на мосце, размешчаным над зліццём рэк Муха і Вець, дзе ўтвараецца Мухавец. Мост са скульптурнай кампазіцыяй, якая сімвалізуе мужчыну і жанчыну, даўно стаў славутасцю горада. І вялікія жалезныя замкі яго дакладна не ўпрыгожвалі. Тым больш там зусім невялікая стаянка для аўтатранспарту.

— Але ж, забараняючы нешта, трэба прапаноўваць альтэрнатыву, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Пружанскага райвыканкама Аляксандр БУШУК.** — Таму і вырабілі вялікую металічную канструкцыю ў выглядзе сэрца. Сэрца мацуецца на падстаўцы, якую ўпрыгожвае надпіс «Каб дом быў люб і моцным шлюб». Вось на гэтым сардэчным «паралелі-мерыдыяны» і змогуць чапляць свае замкі закаханыя. А ключ прапануецца выкінуць у скрыньку, якая ўстаноўлена побач. Сэрца размясцілі ля ўваходу ў гарадскі парк, куды маладыя з ахвотай ездзяць на фотасесію.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ДА СВЯТА — ВУЛІЦА І СКВЕР

**Мітынгі памяці з нагоды 71-й гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прайшлі ля мемарыяла «Вечны агонь» і на Алеі герояў.**

Гомель стаў першым абласным цэнтрам Беларусі, вызваленым ад захопнікаў у выніку Гомельска-Рэчыцкай аперацыі войскаў Беларускага фронту. Да свята ў Навабеліцкім раёне адкрылі абноўлены сквер, якому ў верасні было прысвоена імя двойчы Героя Савецкага Саюза Паўла Галавачова. Сюды перавезлі адрэстаўраваны бюст лётчыка, які раней стаяў ля ліцэя будаўнікоў. Павел Галавачоў — выхадзец з вёскі Кашалёва Буда-Кашалёўскага раёна, да вайны ён вучыўся і працаваў у Навабеліцы. Лятаў на знішчальніках, асабіста збіў 31 самалёт.

Дзень вызвалення Гомеля таксама адзначаны адкрыццём руху па адной з асноўных транспартных артэрый, якая злучае цэнтр з Савецкім раёнам. Рэканструкцыя вуліцы Барыкіна адбывалася ў некалькі этапаў, і вось нарэшце адкрыты апошні адрэзак перад транспартнай развязкай. Дарэчы, значнае пашырэнне гэтай вуліцы павінна знізіць напружанасць руху ва ўсім горадзе.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Па абмене

## УРАЗІЛІ ГАСЦІННАСЦЮ І ЎМЕННЕМ ПРАЦАВАЦЬ

**Дванаццаць прадстаўніц жаночага руху з розных рэгіёнаў Расіі прыехалі ў нашу краіну, каб пазнаёміцца з умовамі працы і побыту сельскіх жанчын. Гэты візіт адбыўся ў межах пагаднення аб узаемным супрацоўніцтве паміж грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускі саюз жанчын» і «Саюз жанчын Расіі».**

Па праграме візіту ўдзельніцы дэлегацыі наведалі УП «Азярыцкі-Агра», што ў аграгарадку Слабада Смалявіцкага раёна, ААТ «Слуцкія паясы», СВК «Вясейскі пакроў» Слуцкага раёна, агракамбінат «Ждановічы».

— Мы з задавальненнем прымаем дэлегацыю ў нашай краіне, — падкрэсліла **намеснік старшыні праўлення Беларускага саюза жанчын Рэгіна ДАВІДОВІЧ.** — Многія з жанчын упершыню ў нас, і мне вельмі прыемна, што ёсць магчымасць падзяліцца нашымі напрацоўкамі, праграмамі, а таксама паказаць, чым мы жывём і як працуем. Мы невыпадкова наведвалі з гасцямі менавіта тыя гаспадаркі, якімі кіруюць жанчыны: нам хацелася паказаць, на што здольны беларускі.

Таксама падчас візіту быў праведзены «круглы стол» на тэму: «Сельская жанчына — аснова жыцця на зямлі», удзельніцы якога расказвалі пра сваю працу на месцах, дасягненні ў сваіх гаспадарках і штодзённых клопатах у сем'ях.

— Я лічу вельмі важным абменьвацца вопытам, — пракаменціравала свае ўражанні **намеснік Наўгародскага аддзялення Грамадскага руху сельскіх жанчын Расіі, прадпрымальнік Святлана ТРУШЧАНЬКОВА.** — Асабіста мяне як прадпрымальніка вельмі зацікавілі структура і бізнес вашых аграгарадкоў. Пазнавальнымі былі і размовы з прадстаўнікамі прафсаюзаў, бо гэта новы кірунак маёй грамадскай дзейнасці. Хачу адзначыць, што нам ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго. У гэтым сэнс развіцця і імкнення не толькі чалавека, але і краіны ў цэлым. Таксама я пазнаёмілася бліжэй з беларускімі жанчынамі, якія прывялі мяне ў захапленне не толькі сваім уменнем працаваць, але і неверагодный гасціннасцю.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**

■ Не прапусціце!

# ВЫСТАВА З ПАХАМ ЕЛКІ

## Магілёўскія «чараўніцы» падрыхтаваліся да Новага года. А вы?

**Акунуцца ў таямнічую атмасферу зімовых свят можна, завітаўшы на выставу гарадской народнай студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чараўніцы», якая адкрылася ў Магілёўскім музеі этнаграфіі. Ёлкі і дзяды-марозы, снягуркі і казачныя істоты, віншавальныя паштоўкі і шмат чаго іншага, арыгінальнага і крэатыўнага, можна тут пабачыць і ўзяць сабе на заметку. Асабліва гэта будзе карысна тым, каму надакучыла сустракаць Новы год па-даўнейшаму і душа шукае чагосьці незвычайнага. Ідзі тут проста лунаюць у паветры.**



Ганна ЛАШКЕВІЧ і Надзея ЯКІМАВА — сапраўдныя чараўніцы.

Ну чым не прыклад для пераймання — насценная ёлка? Для святочнага настрою дастаткова ўпрыгожыць кавалак тканіны рознымі пацеркамі, як гэта зрабіла аўтарка Ганна Лашкевіч. Атрымалася вельмі стыльна і практычна. І не спатрэбіцца даставаць з антрэсоляў банальнае штучнае дрэва. Нельга абыякава прайсці і міма аўтарскага таршэра з прышпэленымі збоку навагоднімі валёнкамі.

— Мне вельмі падабаецца ствараць нешта незвычайнае, — кажа Ганна. — Рукадзелле — гэта стан маёй душы. Я нават у аўтобусе ці цягніку еду з вязаннем. Вяжу абрусы вялікія, пледы, шалі. Вось пачала біжутэрыяй займацца. Задумак шмат, а часу для іх рэалізацыі не хапае.

Такіх захопленых, як Ганна, у студыі «Чараўніцы» хапае. Яе кіраўнік Надзея Якімава вельмі ганарыцца тым, што ёй удалося расшыфраваць вясельны ручнік 1909 года і годна прадставіць на абласным фестывалі сямейнай творчасці «Сузор'е талентаў». Першы прыз студыі быў забяспечаны. А вось яе даніна сучасным відам творчасці — лялькі-тыльды. У некаторых з іх ёсць рэальныя прататыпы. Той жа клоўн Алег Папоў угадваецца ўжо па адной сваёй кепцы ў клетку.

Кожны аўтар — гэта цэлы свет, поўны розных гісторый і захапленняў. Саломка, тканіна, дрэва, кардонныя каробкі, нават бляшанкі з-пад кавы — усё ідзе ў работу. Людміла Атрошкіна выкарыстоўвае для сваіх скрыначак і ігольніц тое, што мы звычайна адпраўляем на сметнік. І ў яе атрымліваюцца вельмі карысныя і прыгожыя рэчы. Нават брат з Санкт-Пецярбурга заказвае ў яе вырабы на продаж. У паўночнай сталіцы вельмі карыстаюцца поспехам рэчы «пад даўніну». Тое, што яна прынесла для выставы, — толькі малая частка яе хатняй калекцыі. Асаблівы гонар — вялікі дыван (яго, на жаль, няма на выставе), які яна «выбівала» ніткамі і ўпрыгожвала кветкамі з меланжу аж 8 гадоў.

— У дарэвалюцыйнай Расіі часткай адукацыі любой маладой жанчыны, якая вучылася ў гімназіі, інстытуце высакародных дзяўчат, было вывучэнне розных відаў рукадзелля, — кажа **загадчыца музея этнаграфіі Святлана Рыбакова.** — Без гэтага ніякая адукацыя не магла лічыцца поўнай. Усе гэтыя навыкі навучэнкі атрымлівалі на вельмі высокім узроўні. Гаворка ідзе пра дамскае рукадзелле, сялянскае — гэта асобная тэма. Дык вось тое, што ствaралася да рэвалюцыі — гэта асаблівы від мастацтва. Пры новай уладзе яму ўжо не надавалася такога значэння. Жанчыны ўспомнілі пра рукадзелле зноў ужо ў цяжкія пасляваенныя 50-я гады, калі не было ў што апрануцца і не хапала сродкаў упрыгожыць свой побыт. Пачалося павальнае захапленне вышыўкай па канве. Ствараліся пано, накідкі на канапы, дарожкі, сурвэткі ў тэхніцы рышэлье.

Адметна тое, што майстрыхі студыі «Чараўніцы» неаднаразова адзначаліся на розных узроўнях. Іх вырабы вядомыя і за межамі краіны. Дарэчы, яшчэ адной нагодай для выставы стала 20-годдзе студыі. Аўтары сабралі ўсё лепшае, што было імі створана за гэты час. Пра тое, што калектыў развіваецца і рухаецца наперад, сведчыць і чарговая ўзнагарода. На адкрыцці выставы **намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ** уручыў калектыву падзячны ліст і пажадаў далейшых поспехаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара**

# УРАЧ, ПАЦЫЕНТ І КАМП'ЮТАР

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Бадай, самай прагрэсіўнай сярод еўрапейскіх стала сістэма eHealth Эстоніі. Тут стварылі Цэнтральную базу звестак здароўя, якая ўзаемадзейнічае з рознымі мабільнымі прыладамі і збірае інфармацыю пра жыхароў на аснове персанальных ID. База ахоплівае ўсю краіну і рэгіструе гісторыі захворванняў «ад нараджэння да смерці». У яе можна дабраахвотна аддаваць інфармацыю з мабільных прылад, такіх як пульсометр, крокамер і інш. Электронная медыцына для эстонцаў — гэта адразу чатыры паслугі: электронная гісторыя здароўя, электронная рэгістратура клінік, база рэнтген-здымкаў і электронны рэцэпт, які замяняе рэцэпт папяровы і абслугоўваецца ўсімі аптэкамі краіны. Летась у Расіі завяршыўся першы этап стварэння Адзінай дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы ў галіне аховы здароўя — тысячы лячэбных устаноў атрымалі абароненыя сеткі, доступ да інтэрнэту, аўтаматызаваныя працоўныя месцы. Былі створаны федэральныя сэрвісы (рэестр нарматыўна-даведачнай інфармацыі, электронная рэгістратура, сістэма вядзення інтэграванай электроннай медыцынскай карткі і г.д.).

**У нас ёсць магчымасці для дыстанцыйнага кансультавання арганізацый аховы здароўя раённага і абласнога ўзроўню ў вядучых спецыялістаў абласных і рэспубліканскіх медарганізацый па рэнтгеналагічных, ультрагукавых і цыталагічных даследаваннях, а таксама па пытаннях пастаноўкі дыягназу пацыентам у складаных выпадках.**



### КАМП'ЮТАРЫ ЎЖО ЁСЦЬ

У нашай краіне ўсе ўстановы аховы здароўя ў той ці іншай ступені аснашчаны камп'ютарамі. Нават ФАПы і ўрачэбныя амбулаторыі. Іншая рэч, гэтай тэхнікай там могуць не карыстацца, бо... у гэтым не ўзнікла вострай патрэбы ў саміх пацыентаў. Што зробіш, не заказвае мясцовае насельніцтва талончык па інтэрнэце, не рвецца атрымаць кансультацыю па Skype... Зразумела, што інфарматызацыя найбольш актыўна развіваецца ў буйных гарадах, і ў першую чаргу — у сталіцы. У шэрагу рэспубліканскіх і абласных устаноў працуюць комплексныя медыцынскія аўтаматызаваныя сістэмы, якія ахопліваюць розныя падраздзяленні, пачынаючы з прыёму хворага ў стацыянары і заканчваючы яго выпіскай. Аўтаматызаваны працоўныя месцы ўрачоў ультрагукавой дыягностыкі, рэнтгенолага, эндаскапіста, урача агульнай практыкі і некаторых іншых. Ва ўстановах аховы здароўя Мінска завяршыўся этап аўтаматызацыі працэсу вядзення звестак (звесткі пашпарта, анамнез) аб пацыентах, атрымання і апрацоўкі неабходных статыстычных даных. Гэта стане асновай аўтаматызаванай электроннай медыцынскай карткі амбулаторнага пацыента і стацыянарнага хворага.

— Электронная ахова здароўя — гэта тая непазбежнасць, да якой мы крочым свядома і паступова, — кажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Цяпер ідзе работа па фарміраванні электроннай амбулаторнай карткі, якая дазволіць розным спецыялістам атрымліваць усю неабходную інфармацыю. Доступ да такой інфармацыі ў любы час атрымае і сам пацыент. Гэта і будзе электронны пашпарт здароўя — з пазначэннем перанесеных захворванняў, зробленых даследаванняў і г.д. Далей неабходна забяспечыць сувязь усіх арганізацый аховы здароўя паміж сабой. Элементы гэтай сувязі сфарміраваны ў многіх рэгіёнах. Яшчэ мы гаворым пра тэлемедыцынскія тэхналогіі, якія робяць магчымымі кансультацыі ў аддаленым доступе. У нас ёсць магчымасці для дыстанцыйнага кансультавання арганізацый аховы здароўя раённага і абласнога ўзроўню ў вядучых спецыялістаў абласных і рэспубліканскіх медарганізацый па рэнтгеналагічных, ультрагукавых і цыталагічных даследаваннях, а таксама па пытаннях пастаноўкі дыягназу пацыентам у складаных выпадках. Адпрацаваная тэхналогія аддаленага кансультавання электракардыяграм. Падчас аднаго пілотнага праекта ўрачы агульнай практыкі Астравецкага раёна атрымалі магчымасць кансультацыі на ўзроўні прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, урачы раёна атрымалі магчымасць дыстанцыйнага навучання падчас правядзення акадэміяй прафесійных семінараў.

### ШТО ЗА ПАСЛУГІ?

Якія важныя паслугі могуць прапаноўвацца ў электронным выглядзе? Выдача ліцэнзій (на ажыццяўленне медыцынскай і фармацэўтычнай дзейнасці); рэгістрацыя лекавых сродкаў; тэлемедыцынскія кансультацыі; запіс на прыём да ўрача; доступ пацыента да сваёй медыцынскай інфармацыі (вынікі аналізаў і даследаванняў, дыягназы і заключэнні ўрачоў, выпіскі з амбулаторнай карткі); нагадванне пацыенту аб чарговым дыспансерным аглядзе (праз асабістую старонку пацыента на інфармацыйным партале медустановы, па электроннай пошце, праз рассылку SMS-паведамленняў і інш.); выпіска электронных рэцэптаў.

Чаму інфарматызацыя прасоўваецца не так хутка, як хацелася б? У першую чаргу, з-за абмежаваных фінансавых магчымасцяў для набыцця вылічальнай тэхнікі і праграмнага забеспячэння, стварэння лакальных вылічальных сетак і іх падключэння да надзейных хуткасных каналаў сувязі, недахоп кадраў IT-спецыялістаў у арганізацыях аховы здароўя. Практычна не вырашаны пытанні інфармацыйнай бяспекі. Сёння ёсць толькі дзве інфармацыйныя сістэмы, якія атрымалі атэстат па інфармацыйнай бяспецы: інфармацыйная сістэма РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі і рэспубліканская інфармацыйна-аналітычная сістэма па медэкспертызе і рэабілітацыі інвалідаў Рэспублікі Беларусь.

— Кожная арганізацыя аховы здароўя мае свой план, праграму інфарматызацыі, — тлумачыць **загадчык аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, упраўлення і эканомікі аховы здароўя Сямён ПАЛЯКОЎ.** — У бліжэйшы час павінна цалкам завяршыцца інфарматызацыя першаснага звяна. З працоўнымі месцамі ўрачоў агульнай практыкі справа вырашана на 100 працэнтаў, чаго не скажаш аб працоўных месцах вузкіх спецыялістаў. На сёння медыцынскія інфармацыйныя сістэмы распрацаваны для ўсіх тыпаў устаноў — паліклінік, дыспансераў і г.д.

Трэба разумець, што кожнае аўтаматызаванае месца патрабуе свайго электроннага забеспячэння. Сотні камп'ютараў некаторых буйных клінік неабходна аб'ядноўваць у лакальную сетку з магутным серверам. Адна з самых важных задач — інтэграцыя медабсталявання ў інфармацыйную сістэму, аўтаматызаваная апрацоўка ўсіх даных на лакальным узроўні. Усё гэта вельмі цесна звязана ў цэлым з працэсам развіцця інфарматызацыі ў краіне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Мара, а не паліклініка

**Галоўны ўрач 29-й гарадской паліклінікі г. Мінска Раіса ЗВАНЕЦ:**

*— Наша паліклініка абслугоўвае каля 36 тысяч чалавек. У нас аўтаматызавана працоўнае месца кожнага ўрача. Пачынаць, вядома, давялося з рэгістратуры, каб адразу вырашыць праблему размеркавання талонаў, нагрузкі на ўрачоў, фарміравання агульнай базы звестак аб пацыентах — хто ў нас ільготнік і г.д.*

*Сёння нават тыя спецыялісты, асабліва больш сталага ўзросту, якія казалі, што ніколі не сядуць за камп'ютар, чуць не жадаюць аб папяровых носьбітах, картках. Хоць мы ад апошніх не адмовіліся, бо ёсць яшчэ пакуль у іх вытворчая неабходнасць.*

*У нас ёсць цяпер электронны дзённік урача — пратакол агляду пацыента, электронная картка пацыента, куды трапляюць вынікі тых жа аналізаў. Ёсць і электронны рэцэпт, які пасля запаўнення раздрукоўваецца пацыенту. Выпіскі з карткі, кантроль за якасцю лячэння — усё гэта стала нашымі зручней.*

**Галоўны ўрач 34-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Наталля ДЗЯРГАЧ:**

*— У нас ёсць Skype-кансультаванне па тых пытаннях, якія хвалююць пацыентаў, паводле вызначанага для ўрачоў графіка. Паліклініка праводзіць, напрыклад, скрынінг па раку малочнай залозы. Усе мамаграмы захоўваюцца ў электронным варыянце і ў нас, і ў гарадскім анкадыспансеры, куды мы накіроўваем дыягнастычныя звесткі. Па жаданні пацыентаў можам перадаць ім па электроннай пошце, напрыклад, вынікі аналізаў або інфармацыю аб здаровым ладзе жыцця, аб рэабілітацыйных мерапрыемствах.*

## Марына ГАЛАЧОВА:

# «Тое, што вы бачыце на экране, у жыцці выглядае інакш»



**Мы захапляемся прыгажосцю людзей на экране, але не заўсёды ведаем тых, чыімі рукамі яна створана. Таму хочацца пазнаёміць вас з жанчынай, якая ведае ўсё пра макіяж і ўражвае не толькі расповедам пра прафесію візажыста, але і талентам адрозніваць сапраўдную прыгажосць ад прыгожай карцінкі. Марына Галачова — прызнаны майстар у сферы прыгажосці, з'яўляецца лаўрэатам многіх конкурсаў, аднак свае ўзнагароды ўспрымае як стымул прафесійнага росту. Бо, як заўважае жанчына, калі вам здаецца, што вы дасягнулі вяршыні ў сваёй прафесіі — значыць, час пачынаць усё спачатку...**

**Пры сустрэчы Марына (яна працуе яшчэ і мастаком-грымёрам у Агенцтве тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі) расказала, як рыхтуюць да эфіру вядучых, што рабіць з капрызнымі кліентамі і ў чым сакрэт сапраўднай прыгажосці...**

***— Адзін вядомы чалавек сказаў, што адзенне можа змяніць не толькі постаць, але і нораў. Мабыць, і макіяж дапамагае стварыць не проста прыгожы вобраз?***

— Макіяжам мы мяняем не толькі знешнасць, але і адлюстроўваем характар. Трэба стварыць вобраз для вядучай навін — значыць, робім строгі макіяж, не падкрэсліваючы нічога. А возьмем вячэрні варыянт макіяжу — там ужо можна трохі разняволіцца, дадаць яркія дэталі. І настрой кожны з варыянтаў стварае ў жанчыны свой.

***— Прафесіяй візажыста вы пачалі займацца адносна нядаўна. Як атрымалася, што інжынер-эканаміст кардынальна змяніў сферу дзейнасці?***

— Творчая сфера мяне заўсёды вабіла. Памятаю, нават на лекцыях сядзела і малявала розныя коміксы. Аднак вывучылася па прафесіі і нават пэўны час працавала інжынерам-эканамістам. А пасля дэкрэта зразумела: не змагу на раскладзе працаваць кожны дзень. І хачу пражываць жыццё, а не проста існаваць. Адважылася на кардынальныя перамены — пайшла вывучаць макіяж. Улічваючы, што дагэтуль я сама рэдка фарбавалася, гэта быў перш за ўсё асабісты інтарэс. Прыйшла вучыцца ў студыю Вікторыі Макейчык.

***— Ведаю, што на тэлебачанне вы прыйшлі праз кастынг. Як праходзіць адбор грымёраў?***

— Было боязна. Прыйшла, перада мной пасадзілі ў крэсла вядучую і сказалі: «Працуй! Праз дзве гадзіны ў яе эфір». І ты застаешся з чалавекам сам-насам. З аднаго боку, трэба паказаць сябе, а тут яшчэ і зусім незнаёмы чалавек. У такія моманты самае важнае — сабрацца і прыступіць да працы... Падрыхтавала я адну вядучую да эфіру, і мне далі яшчэ аднаго чалавека — зрабіць макіяж ужо для вячэрняга выпуску навін. Потым сказалі, што месяцы праз тры можна чакаць званка, бо яшчэ дакладна невядома, ці будуць яны браць новага спецыяліста ў штат. Я на той час толькі пачынала рабіць крокі ў прафесіі, таму, як і многім, было складана паверыць у свае сілы. Вырашыла, што нічто не патэлефануе, мабыць, знайшлі для сябе іншага грымёра. Але ўжо наступным вечарам мне пазванілі і паведамілі: «Можаце выходзіць на працу». Цяпер я разумею: калі прыходзіш на кастынг, то важна паказаць не толькі рукі, але і ўменне кантактаваць з людзьмі...

***— Што самае важнае для грымёра ў працэсе працы?***

— Знайсці падыход да чалавека, зразумець яго жаданні і адчуць, з якім настроем ён прыйшоў да цябе. Вядучая толькі села ў крэсла — і ўжо разумееш, разняволеная яна (бачыш: чалавек табе поўнасцю даверыўся і тады можаш рабіць тое, што лічыш патрэбным) альбо, наадварот, напружаная (дрэнны настрой ці абдумвае будучы эфір). І ў залежнасці ад сітуацыі выбіраеш, ці пагаварыць з людзьмі пра нешта нейтральнае, ці памаўчаць і проста недзе мяккім пэндзлікам пагладзіць. Гэтую навуку чалавечых узаемаадносін спасцігаеш у працэсе, і патрэбны час, каб убачыць, хто перад табой.





***— Калі гаварыць пра вобраз людзей на тэлеэкране, якія тут дзейнічаюць правілы, забароны, сакрэты?***

— У Агенцтве тэлевізійных навін тры грымёры, і падыходы да вобразу вядучых адрозніваюцца, бо кожны з нас бачыць іх па-свойму. Што да майго бачання, як павінен выглядаць вядучы навін, то тут да месца класічны, стрыманы макіяж. Блёсткі ці яшчэ нейкія дэталі проста недапушчальныя. Бываюць выпадкі, калі я рыхтую чалавека да эфіру, а потым вядучая яшчэ плануе нейкае мерапрыемства — тады можна зрабіць некаторыя акцэнты. Наогул, камера вельмі скажае адцені, таму нейкія «навінкі» ў вобразе часта і не заўважыш. Для экрана я прытрымліваюся манахромнай гамы колераў — напрыклад, пясочна-карычневыя адцені. Важна таксама, каб была ідэальная лінія броваў, тон твару, контур вуснаў, бо некаторыя гледачы звяртаюць асаблівую ўвагу на дыкцыю.

...Мы ствараем «карцінку». І тое, што вы бачыце на экране, у жыцці мае зусім іншы выгляд. Вядучыя прыходзяць да нас у грымёрку, і мы мяняем іх знешне, арыентуючыся на прыдуманы і ўзгоднены з кіраўніцтвам вобраз. І ад гэтага ў многім залежыць успрыманне інфармацыі і яе падача.

***— Як можна з дапамогай касметыкі змяніць чалавека?***

— Па сутнасці, выкарыстоўваючы касметыку, можна кардынальна змяняць знешнасць чалавека. Цені — не проста фарба, а паўтон, які здольны мяняць вочы. Пры нанясенні макіяжу, можна сказаць, мы лепім твар па-новаму. Нават састарыць чалавека можна адным штрыхом, калі, напрыклад, выбраць палітру колераў, якія не пасуюць вашаму кліенту. Бо правільна падабраныя колеры ўпрыгожваюць людзей, асвяжаюць іх выгляд.

***— Ці складана працаваць з вядучымі-мужчынамі?***

— З мужчынамі вельмі проста працаваць. Бо такіх вядучых адразу выбіраюць, улічваючы, наколькі гарманічна яны глядзяцца ў кадры. І калі вядучыя прыходзяць у грымёрку, то ім я таніравала твар — гэта самае важнае, таму што камера ўмее «разгледзець» нават маленькі нюанс. Укладваем бровы, можна нават вусны падфарбаваць, але ўсё робіцца ў натуральных адценнях. Тут, мабыць, і тоіцца найбольшая складанасць — дабіцца добрага выгляду вядучага, але паказаць адсутнасць касметыкі.

***— Бываюць капрызныя кліенты?***

— Для мяне праяўляць дрэнны настрой — вяршыня непрафесіяналнасці. І калі чалавек так сябе паводзіць, то тым самым дэманструе сваю нявыхаванасць. Бо ён павінен паважаць вас як прафесіянала. У такіх сітуацыях выйсце толькі адно — спрабаваць знайсці падыход. І калі табе гэта ўдаецца, то, лічы, на дзевяноста працэнтаў макіяж будзе ўдалым.

***— Як сям'я ставіцца да вашай прафесіі?***

— Церпяць. Ведаюць, што па-іншаму немагчыма. Я знайшла сябе ў гэтай сферы і таму нават не стаіць пытанне, ці дастаткова я зарабляю і наогул ці прынясу грошы дадому. Бо здараецца, што зарплата траціцца вельмі хутка... Не ўсе родныя ўспрымаюць маю працу сур'ёзна. Бывае цікавяцца, калі ўжо кіну займацца «гэтым» і пайду працаваць у банк. А я без сваёй працы проста жыць не магу. Калі ўявіць, што буду хадзіць на працу ад званка да званка, мець два выхадныя і выхоўваць сына, то шчаслівай наўрад ці змагу сябе адчуваць. І сын будзе бачыць, як маці проста зарабляе грошы, а не жыве цікавым жыццём. Мой муж мяне падтрымлівае, бо і сам ён чалавек творчы, таму разумее, наколькі важна мець любімы занятак.

***— Пры выбары сродкаў для штодзённага макіяжу якім варта аддаваць перавагу?***

